**Кажамякін Г.В. (Мінск)**

## Культурная спадчына Максіма Танка ў фондах бібліятэкі БДПУ

У бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка ёсць фонд рэдкай кнігі, у якім захоўваюцца кніжныя рарытэты ад сярэдзіны XVIII стагоддзя да 1946 г. уключна, выданні факсімільныя і факсімільнага тыпу, рэпрынтныя і наогул каштоўныя, а таксама аўтографы. Сярод іх можна знайсці тое, што звязана наўпрост з імем Максіма Танка. Па-першае, гэта выданні яго кніг, па другое – адзін аўтограф.

Зборнік "На этапах", які захоўваецца ў бібліятэцы, з'яўляецца факсімільным выданнем 1983 г. паводле 1936 г. На яго тытульным аркушы – перакрэслены штамп: "Саюз пісьменнікаў БССР. Бібліятэка". Гэтая правененцыя надае асобніку яшчэ большую каштоўнасць. Як вядома, частка былога фонду названай бібліятэкі, а яна знаходзілася ў Доме літаратараў, перадавалася пасля яе расфармавання ў іншыя кніжніцы. Магчыма, што гэты асобнік трымаў у руках сам Максім Танк. У кнізе маюцца падкрэсліванні, пазнакі, запісы, зробленыя алоўкам і шарыкавай ручкай. Перавыданне мае супервокладку, на адвароце якой змешчаны тлумачальны тэкст без подпісу.

Гісторыя гэтага першага зборніка яшчэ маладога заходнебеларускага паэта даволі няпростая. Амаль увесь наклад кнігі быў арыштаваны. Засталіся толькі лічаныя асобнікі. І таму выданне сапраўды з'яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю. Як адзначана ў выхадных звестках факсімільнага выдання, яно падрыхтаванае паводле экзэмпляра, што захоўваецца ў асабістай бібліятэцы Арсена Ліса. Трэба адзначыць, што ў свой час такія бібліяфілы, як Арсен Ліс, Барыс Сачанка і інш. здолелі сабраць і захаваць значную частку каштоўнай кніжнай спадчыны беларускага кнігадруку, у значнай ступені віленскага. Некалі пасля смерці або арышту беларускіх нацыяналістаў у перыяд бальшавіцкіх рэпрэсій заставаліся без гаспадара іх хатнія кнігазборы. Частка такіх кніжніц загінула, частка распылілася па іншых калекцыях, нешта сышло ў замежжа, у тым ліку і паасобныя рукапісы, напрыклад, Максіма Багдановіча. І калі нашы руплііўцы шукалі і ратавалі ў пасляваенныя дзесяцігоддзі прыватныя кнігазборы, дык такія высілкі можна лічыць проста святой справай. Трэба мець на ўвазе, што нешта з кніжных рарытэтаў нам вядома толькі ў колькіх, а то і адным асобніку. І часам пры падрыхтоўцы да выдання твораў нейкага беларускага пісьменніка мы сутыкаемся з вялікай праблемай пошуку пэўнай кнігі. Таксама варта згадаць, што не ўсе яны захаваліся ў належным стане. Пры бібліяграфічным апісанні часам адзначаецца, што асобнік дэфектны, няпоўны. Іначай кажучы, бываюць пашкоджанні кніжнага выдання, адсутнасць аркушаў ці іх фрагментаў, а таксама страта раней прыклееных ілюстрацый. Некаторыя аркушы выразалі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вырывалі па палітычных цэнзурных прычынах, часам асобныя словы закрэмзвалі чарнілам. Такі цярністы шлях прайшла рэдкая цяпер кніга.

З выданняў перадваеннай пары ў нас захоўваецца паэтычны зборнік Максіма Танка "Пад мачтай" (Вільня, 1938). Экзэмпляр кнігі, акрамя вокладкі, часткова зношанай, захаваўся ў даволі добрым стане. Як бачна, ён доўгі час нават заставаўся нечытаным, бо аркушы былі неразрэзаныя. Калі бібліятэка мае колькі асобнікаў аднаго выдання, то можна было б дапусціць, што кніга застанецца ў такім першасным стане. Але адзіны экзэмпляр звычайна разразаюць пры вывучэнні фаліянта, што і давялося зрабіць. Кніга мае і ўнутраныя загалоўкі асобных частак: "Пад мачтай", "Каліноўскі", "Казкі". Выхад зборніка стаў несумненнай чарговай падзеяй у заходнебеларускім пісьменстве. Беларуская ж літаратура ўвогуле перажывала тады не лепшыя часы. У асобе гэтага паэта ў яе нібы ў мелкую раку ўліўся свежы і светлы ручай. Загучалі новыя для айчыннай паэзіі вобразы: “Заснулі стрэхі, купалы і ліпы; / зьлізала ноч нэонаў сініх кроў, / і брук апошні шопат вуліц выпіў / фіятаў, фордаў і віно гудкоў. / Асірацелі і муры бажніцаў: / з іх выйшаў Будда, Магамэт, Хрыстос / туды, дзе стрэх салома залаціцца, / дзе месяц жне спазьніўшыся авёс” [1, с. 33].

Таксама бібліятэка мае асобнікі зборнікаў Максіма Танка "Вастрыце зброю" (1945)", "Праз вогненны небасхіл" (1945)". Як бачна, яны выйшлі ў адзін год, але менавіта ў названым парадку, што вынікае з датаў падпісання да друку. Абодва выданні рэдагаваў вядомы беларускі пісьменнік Міхась Клімковіч, а ў другім з іх ён нават змясціў уступны артыкул "Максім Танк". На яго змесце, ідэалогіі адбілася тагачасная палітычная сітуацыя з яе класавай барацьбой, асуджэннем буржуазнай культуры… Вядома, што падобнае ў свой час адлюстравалася і ў паэзіі самога Максіма Танка. Напрыклад, у кнізе "Вастрыце зброю" ёсць верш пад назвай "Сталін так казаў". На жаль, такі быў час, і сёння асуджаць паэта не даводзіцца. Гартаючы гэтыя кнігі, іх зусім не хочацца адкінуць у бок. Як залаты фонд беларускай паэзіі гучаць такія вершы, як "Родная мова", "Песня кулікоў"…

Названы аўтограф Максіма Танка зроблены на тытульным аркушы выдання: *Яковлев А. Холопство и холопы в Московском государстве XVII в.: по архивным документам холопьего и посольского приказов оружейной палаты и разряда. – Т. 1. – М.-Л., 1943*. Зверху старонкі па дыяганалі блакітным чарнілам зроблены надпіс: *"Максім Танк. Масква 4- IV 44 г."*

У бібліятэказнаўстве і кнігазнаўстве гэта называецца ўладальніцкім аўтографам. Такім чынам, мы можам меркаваць пра тое, якую літаратуру чытаў пісьменнік у часе эвакуацыі ў Маскве ў перыяд Другой сусветнай вайны. Адсюль вынікае тое, што ён цікавіўся і пытаннямі гісторыі, яе

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

архіўнымі матэрыяламі. Паколькі кніга апынулася ў бібліятэцы пры жыцці Максіма Танка, дык верагодна, што сам паэт падараваў яе для нашай кніжніцы. Асобнік кнігі захаваны параўнаўча добра, але на некаторых старонках маюцца сляды пашкоджання ад вады.

Іншых аўтографаў Максіма Танка ў нашай бібліятэцы пакуль не выяўлена. Але і тое, што маем, з'яўляецца для нас бясцэннай гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

Калі нашай установе нададзена імя Максіма Танка, бібліятэка мусіла б мець і сярод рэдкіх кніг значна больш такіх каштоўных рарытэтаў. Але час ідзе, адбываецца папаўненне фонду новымі паступленнямі выданняў. Магчымы і кнігаабмен з іншымі кніжніцамі дублетнымі асобнікамі, а таму можна чакаць і з'яўлення ў нас новых старых фаліянтаў, звязаных з імем класіка беларускай літаратуры.

Літаратура

1. Танк, М. Пад мачтай / М. Танк. – Вільня, 1938.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ